

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 25 (677) ● ПЯТНІЦА, 8 верасня 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

## ТОЛЬКІ НАПЕРАД

Пачаўся новы навучальны год. Для нашай універсітэцкай камсамоліі, як і для ўсяго савецкага народа, гэта год асаблівых намаганняў—ён юбілейны. Сустрэць 50-годдзе Савецкай улады старannымі поспехамі ў вучобе, павышэннем асабістай адказнасці за ўдзел у грамадскім жыцці—доўг кожнага камсамольца-студэнта. У гэтым кірунку ўжо зроблена нямала. Ідучы насустрач юбілею савецкай краіны, кожны калектыў, кожны камсамолец асабіста ўносіць свой пасільны ўклад у агульную справу будаўніцтва камунізма. Акрамя напружанай вучобы і навукова-даследчай дзейнасці, якая з кожным годам усё больш і больш пашыраецца, для нашага камсамольца стала ўжо звычаем удзельнічаць і ў трэцім гадавым семестры—працоўным. Не паспеў закончыцца другі навучальны семестр—а ў камітэты камсамольскіх арганізацый адна за адной паступаюць заявы, у якіх жаданне і просьба паехаць у далёкую Уральскую вобласць, у сібірскую тайгу, на будоўлі Беларусі. Жадаючых працаваць многа. Адбіраюцца дастойныя. Так было і ў гэтым юбілейным годзе...

Прайшло лета. З розных куткоў краіны вяртаюцца студэнты ў аўдыторыі. Бадзёрым, узмужнелым, ім ёсць чым ганарыцца. Пабудаваны дзесяткі дамоў, прачытана многа лекцый. А колькі працоўных паглядзела выступленні мастацкай самадзейнасці! Усяго не пералічыш. Адным словам, камсамольцам універсітэта ёсць аб чым рапартаваць 50-гадовай краіне.

Пачынаецца новы навучальны семестр. Для першакурсніка ён першы. Мы верым, што новае малодшае папаўненне камсамольцаў падхопіць нашы лепшыя традыцыі і прынясе нешта новае, сваё, з першых дзён навучання пойдзе ў нагу з камсамольцамі-старшакурснікамі і гэтым самым узніме яшчэ вышэй сцяг ўсёй нашай універсітэцкай камсамоліі.

Дарагі першакурснік! Наперадзе ў цябе пяць гадоў вучобы, змаганняў і цяжкасцей. Ідзі наперад, толькі наперад! Няхай скептыцызм і недавер'е стануць тваім злейшым ворагам. Смялей уключайся ў грамадскую работу, будзь неадступным перад няўдачамі. Праца і калектыў—твае лепшыя сябры. З табой твой старэйшы брат—старшакурснік, камсамолец.

Камітэт камсамола.

## ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У БЛІЖЭЙШЫ час пачнуцца справаздачна-выбарчыя сходы пярвічных партыйных арганізацый універсітэта. Яны будуць праходзіць у знамянальны час — у дні падрыхтоўкі ўсяго савецкага народа, прагрэсіўнага чалавецтва свету да слаўнага юбілею Савецкай улады—50-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Увесь справаздачны перыяд партыйныя арганізацыі знаходзіліся пад уздзеяннем рашэнняў XXIII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Ажыццяўляючы пастановы з'езда, пярвічныя партыйныя арганізацыі накапілі вопыт ва ўнутрыпартыйнай і масава-палітычнай рабоце. Глыбока прааналізаваць накоплены вопыт, усё новае ў рабоце партыйных арганізацый, зрабіць з гэтага належныя вывады на будучае—вось адна з важнейшых задач справаздачна-выбарчых сходаў.

## ВАЖНАЯ ПАЛІТЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

У цэнтры ўвагі партыйных арганізацый будуць стаяць пытанні падрыхтоўкі да сустрэчы 50-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Яны павінны заняць цэнтральнае месца як у дакладах справаздачна-выбарчых сходаў, так і ў спрэчках камуністаў. Але, каб сходы прайшлі на высокім ідэйным і арганізацыйным узроўні, да іх трэба добра падрыхтавацца. Неабходна звярнуць максімальную ўвагу на характар справаздачных дакладаў. Даклад павінен змяшчаць у сабе глыбокі аналіз работы партыйнай арганізацыі, яе форм і метадаў, дзелавую крытыку, прадуманыя прапановы. Да падрыхтоўкі даклада і праекта пастановы неабходна прыцягнуць шырокі актыў камуністаў партыйнай арганізацыі. Толькі такі падыход да падрыхтоўкі справаздачнага даклада дасць магчымасць зрабіць яго больш аб'ектыўным, мэтанакіраваным і дзейсным, што, безумоўна, выкліча ажыўленыя спрэчкі, у ходзе якіх камуністы глыбока ўскрыюць усе недахопы ўнутрыпартыйнай работы, а таксама намецяць шляхі яе паляпшэння.

На сходах павінны быць створаны абставіны адкрытай размовы. А гэта залежыць ад прадуманай работы як прэзідыума схода, так і ад арганізаванасці ўсяго калектыва.

На справаздачна-выбарчых сходах неабходна даць ацэнку работы партгрупорга і ў партгруп у цэлым. Менавіта, яны з'яўляюцца цэнтрам унутрыпартыйнай работы сярод студэнтаў.

У цяперашні час у партыйнай арганізацыі універсітэта налічваецца 11 пярвічных партыйных арганізацый, 31 партгрупа, якія аб'ядноўваюць каля 800 камуністаў. Неабходна так падрыхтавацца да справаздач, каб уключаць у работу справаздачных сходаў усіх камуністаў, пачынаючы ад партыйных груп да ўсёй партыйнай арганізацыі універсітэта.

Трэба замацаваць кадры сакратароў, якія маюць належны вопыт партыйнай работы. Удзельнікі сходаў павінны з усёй адказнасцю падыходзіць да вылучэння кандыдатаў у склад кіруючага актыву, забяспечыць прыход да кіраўніцтва такіх таварышаў, якія здольны ўнесці нешта новае і карыснае ў работу арганізацыі. Гэтага можна дасягнуць толькі ў абставінах правільнага ўжывання дэмакратычных норм пры выбарах кіруючых партыйных органаў і ажыццяўлення камуністамі сваіх правоў.

Справаздачы і выбары ў партыйных арганізацыях—важная палітычная падзея ў жыцці універсітэта. Паспяховае іх правядзенне яшчэ больш павысіць працаздольнасць пярвічных партыйных арганізацый, узмоцніць іх уплыў на шматграннае жыццё універсітэта.

**А. ПІКУЛЕЎ,**
наместнік сакратара парткома па арганізацыйна-партыйнай рабоце.

## ПАСЛЯ ПЕРШАГА ЗВАНКА

Прайшоў роўна тыдзень, калі першы званок абвясціў аб пачатку новага навучальнага года.

Семінары, практычныя заняткі, курсавыя работы, сесіі, канікулы. А пасля зноў семінары, сесіі... Нялёгкі шлях да дыплома, які сапраўды скажа, што ты чалавек з вышэйшай адукацыяй. Але студэнт у час вучобы менш за ўсё думае аб дыпломе. Аб гэтым у яго нават і часу няма думаць. Паглядзіце на верхні здымак. Аб чым думаюць студэнты-першакурснікі фізічнага факультэта? Яны захоплены лекцыяй Марыі Афанас'еўны Сокалавай. У іх галовах перапляцаецца і становіцца на сваё месца мноства ліній, адрэзкаў, формул, на якіх заснавана начартальная геаметрыя. І гэтыя лініі і адрэзкі набываюць форму таго, што цябе акружае паўсядзённа...

Праз пяць гадоў людзі, якія глядзяць цяпер з фатаграфіі — гэта высокаадукаваныя спецыялісты, гаспадары сваёй справы, паўнапраўныя будаўнікі камуністычнага грамадства.

Кожны год БДУ імя У. І. Леніна папаўняецца ўсё новай і новай моладдзю, яе становіцца ўсё больш і больш. Наш універсітэцкі гарадок шырыцца, расце. Толькі за апошнія гады побач з новым галоўным корпусам вырас будынак фізічнага факультэта, па-сучаснаму абсталяваны, прасторны і ўтульны. Але і гэта не ўсё. На нашых вачах нараджаецца новы больш магутны брат-будынак універсітэцкага гарадка — корпус хімічнага факультэта. Ён пакуль што яшчэ ў пялёнках рыштаванняў. А пройдзе час—і аднойчы ў верасьнёўскі дзень ён падасць свой першы здаровы, радасны голас—голас шчаслівай студэнцкай моладзі.



Фота А. КАДЗЕТА.

## ПРОСТА НЕ ВЕРЫЦЦА

Цяжка паверыць нават сёння, што я з'яўляюся студэнтам універсітэта. Не верыцца, што я слухаю цікавыя лекцыі найбольш вядомых вучоных-хімікаў нашай Беларусі, жыву сярод такіх жа як я, улюбёных у хімію, студэнтаў, спрачаюся, хаджу на лекцыі.

Пры паступленні ва універсітэт мне давялося здаваць толькі адзін экзамен: я медаліст. Канешне, аб хімічным факультэце універсітэта я марыў даўно, яшчэ ў школе. І не проста марыў,—рыхтаваўся. Хімія была самым любімым маім прадметам. Яна давалася мне лёгка. Любіў рашаць складаныя задачы, перачытваў многа кніг, якія нават не ўключаліся ў школьную праграму і дзе было многа розных цікавых фактаў з жыцця вядомых хімікаў, нашых і замежных. Але найбольш за ўсё я захапляўся хімічнымі доследамі. Практычныя заняткі па хіміі, якія мы праводзілі ў школе—гэта маё любімейшае «хоббі». Цяпер жа, ва універсітэце, я атрымаў вялікія магчымасці на ўсю сваю моц займацца хіміяй. Багатыя лабараторыі, выдатна абсталяваныя кабінеты — усё гэта радуе і натхняе на працу. Ужо цяпер я знаходжуся ў захапленні ад лекцый па неарганічнай хіміі, матэматыцы. А што яшчэ наперадзе! Цяжка нават выказаць маю першую радасць і захапленне.

Я. СКАКОЎСКІ.

## ДОБРАЯ ЗАДУМА

З кожным днём усё бліжэй і бліжэй падыходзіць да нас знамянальная дата—50-годдзе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Усё лепшае, што дасягаецца нашым народам, прысвячаецца гэтаму юбілею.

Студэнты фізічнага факультэта, напрыклад, горача ўзяліся за цікавую справу—стварыць у сябе на факультэце фотавыстаўку. У гэтай выстаўцы будзе адлюстравана жыццё факультэта, яго поспехі і дасягненні. Значнае месца будзе адведзена трэцяму працоўнаму семестру, які праведзен фізфакам у гэтым годзе на самым дастойным узроўні.

К. АНДРЭЕЎ.

## ПА НОВЫХ АДРАСАХ

Свежая вераснёўская раніца. Яшчэ не паспела ўзыйсці сонца, як да універсітэцкага гарадка з інтэрнатаў і розных куткоў горада пацягнуліся студэнты, з туга набітымі рукзакамі, у рабочай вопратцы. І толькі першакурснікі ды дыпламанты ў гэтую раніцу ішлі з канспектамі і, відаць, з зайздрасцю пaглядалі на тых, каму прадстаяла паехаць у калгасы і саўгасы Міншчыны, каб прадоўжыць трэці працоўны семестр. Чуюцца песні, радасная гутарка. Адна за адной пад'язджаюць калгасныя машыны, а студэнтаў, здаецца, і не меншае. Да парадных дзвярэй цяжка прабіцца. І не дзіўна: універсітэт камандзіруе на калгасныя палеткі каля трох тысяч студэнтаў. У большасці гэта другія, трэція і чацвёртыя курсы.

У гэтым, юбілейным годзе на палях Беларусі ўраджай—на славу. Давялося паехаць на дапамогу калгасам нават і тым, хто працаваў у час летняга адпачынку ў складзе студэнцкіх будаўнічых атрадаў. З аднаго толькі філалагічнага факультэта адкамандзіравана ў калгасы і саўгасы 450 чалавек, у іх складзе два будаўнічыя атрады (па 26 чалавек), якія працавалі на будоўлях Слуцкага і Мінскага раёнаў.

Яшчэ больш студэнтаў пасылаюць фізічны (600 чалавек) і матэматычны (510 чалавек) факультэты. Аб'екты працы ў студэнтаў гэтых факультэтаў самыя розныя. Трэба пабудаваць жылыя дамы ў калгасах «Расія» і «Праўда» Дзяржынскага раёна, кароўнікі ў калгасах «Бальшавік» і імя Чкалава Старобінскага раёна.

Студэнты будуць працаваць на будоўлях бальніц, школ, клубаў—на самых розных аб'ектах. І ўсё ж галоўны фронт дзейнасці ў верасні месяцы—гэта бульба.

Студэнты універсітэта раз'ехаліся. Цяпер у іх самыя розныя адрасы. Копыльскі раён, Чэрвенскі, Мядзельскі, Слуцкі, горад Дзяржынск... Мінскай вобласці.

С. КАЛЕНКОВІЧ.

## ПАМЯЦЬ СЭРЦА

Нядаўна ў сям'і Валянціны Максімаўны Бурмакінай, каменданта хімкорпуса універсітэта, адбылася хвалюючая падзея — прыйшло пісьмо з Ханоя, ад выпускніка БДУ Чан Хан Мая. Валянціна Максімаўна была бязмежна рада—нібы ад сына прыйшоў ліст.

— Два дні мы чыталі яго ўсім гуртам, — гаворыць усхваляваная жанчына.

Знаёмства з Чан Хан Маем адбылося два гады назад на возеры Нарач у час летніх канікул, дзе Валянціна Максімаўна працавала касцяляншай. З таго часу пачалося сяброўства, цеснае і непарушнае. Як свайго сына, заўсёды сустракала яна в'етнамскага хлапчука. Гасцінна запрашала на чай. Шмат гаварылі пра далёкую радзіму Чана, аб барацьбе в'етнамскага народа. І кожная такая сустрэча, кожная гутарка заканчвалася адной думкай: в'етнамскі і савецкі народ будуць навечна разам у барацьбе супраць імперыялістычных агрэсараў.

Чан Хан Май — сціплы і ветлівы малады чалавек. Ён вельмі любіць савецкіх людзей. Сярод яго сяброў нямала беларусаў, рускіх. Разам рыхтаваліся да заняткаў. Разам хадзілі ў кіно. Але настаў час развітання. У руках ужо дыплом выдатніка.

Цяжка перадаць растанне пажылой жанчыны Валянціны Максімаўны Бурмакінай і такога добрага, роднага Чан Хан Мая. Стомлены, ён прыбег да іх дамоў і апусціў галаву:

— Выязджаю я, Валянціна Максімаўна...

Прайшоў некаторы час. І вось з Ханоя пісьмо. Сэрца ўсё ж памятае тое, што некалі было дарагім і такім засталося назаўсёды.

Ніжэй мы друкуем ліст выпускніка фізфака нашага універсітэта Чан Хан Мая.

«Добры дзень, паважаная Валянціна Максімаўна! Хачу паведаміць Вам, што я ўжо прыехаў на Радзіму. Які я шчаслівы, калі зноў бачу сваю родную зямлю праз пяць гадоў! Цяпер наша зямля намнога змянілася. Ад граніцы да Ханоя мы ехалі на аўтобусах ноччу, каб пазбегнуць нападу амерыканскіх самалётаў. Пры святле месяца сваімі вачыма мы бачылі, як амерыканскія самалёты бамбілі нашу родную зямлю, масты, сёлы, чыгунку... Вайна ўжо пракацілася па ўсіх кутках нашай Радзімы, але в'етнамскі чалавек не зломлен. Народ майго краю, як і раней, спакойны і ўпэўнены. Людзі заўсёды жартуюць, смяюцца, пяюць і заўсёды гавораць аб перамозе над амерыканскімі агрэсарамі, аб будучым.

Прыехаўшы ў Ханой, я вельмі здзівіўся. Ханойцы спакойна ідуць на работу, а вечарам, пасля работы, яны гуляюць па вуліцах. У парку, у кінатэатры, у рэстаране поўна людзей, нібы здаўна няма вайны. А калі аб'яўлялі трывогу, былі чутны ўзрывы бомб, ракет, залпы батарэй нашых зенітчыкаў і гул самалётаў. З дня, калі я прыехаў у Ханой, да гэтай пары на тэрыторыі ДРВ было збіта больш трыццаці амерыканскіх самалётаў. Пасля трывогі вуліцы Ханоя зноў запоўнены людзьмі, як бы нічога не здарылася.

Паважаная Валянціна Максімаўна! Прыехаўшы ў Ханой, я часта ўспамінаю Савецкі Саюз. Пакінуўшы СССР, нас ніколі не пакіне пачуццё сімпатыі да савецкага народа, які горача падтрымлівае в'етнамскі народ ў яго справядлівай барацьбе супраць нашага агульнага ворага — амерыканскіх агрэсараў.

Пяць год мы жылі ў Савецкім Саюзе. Гэта час вялікай радасці і дружбы. У маёй душы назаўсёды захаваецца глыбокая падзяка савецкаму народу за вялікую дапамогу нашай Радзіме і асабіста мне у вучобе і жыцці.

У гэтым пісьме я яшчэ раз хачу выказаць сардэчную ўдзячнасць рэктарату, маім паважаным прафесарам, выкладчыкам і ўсім супрацоўнікам універсітэта, якія аказалі мне вялікую дапамогу ў вучобе, далі мне высокую савецкую адукацыю.

Нарэшце, жадаю асабіста Вам вялікіх поспехаў у рабоце, моцнага здароўя і шмат шчасця ў жыцці.

Перадайце, калі ласка, прывітанне маім савецкім і в'етнамскім сябрам, якія вучацца ў горадзе Мінску, ад мяне. Пішыце, калі ласка. Чакаю адказу. Да пабачэння!

Чан Хан Май».



*Дэлегацыя БССР на III студэнцкім традыцыйным свяце песні ў горадзе Тарту.*

## НАС ПЕСНЯ Ў ДАРОГУ ПАКЛІКАЛА

ПЯТАГА ліпеня, золкай раніцай, з двара універсітэцкага гарадка выйшла цэлая калона аўтобусаў. У аўтобусах—220 удзельнікаў мастацкай самадзейнасці універсітэта. Дарога ляжала ў Эстонію, у горад Тарту, дзе нашы студэнты павінны былі прадстаўляць студэнцкую Беларусь на III студэнцкім свяце песні, якое праходзіла пад дэвізам «Гаудэамус ігітур». Народная харавая капэла, Народны аркестр народных інстурментаў, ансамбль, эстрадны аркестр універсітэта павінны былі абараняць гонар беларускіх студэнтаў на гэтым дзівосным свяце.

Мы ведалі, што Эстонія — рэспубліка песні, і таму ўпарта рыхтавалі свае канцэртныя праграмы.

Добрым экзаменам для праверкі нашай падрыхтаванасці да свята быў праведзены раней фестываль самадзейнага мастацтва, дзе нашы калектывы атрымалі дыпломы І і ІІ ступені за паспяховае выступленне і цудоўнае майстэрскае выкананне. Гэта надавала нам яшчэ большую ўпэўненасць у сваіх сілах. Не выпадкова ў Тарту мы ехалі з выдатнымі настроем. Гучалі песні, музыка, жарты... Па дарозе некалькі разоў спыняліся, захапляліся нашай беларускай прыродай, фатаграфаваліся і нават танцавалі на шашы «летку-еньку».

Першым вялікім прыпынкам на нашым шляху быў старажытны горад Пскоў. Тут мы начавалі, а ўсю першую палову дня 6 ліпеня мы прысвяцілі агляду выдатных помнікаў старога і разам з тым маладога горада. А затым—зноў у дарогу.

Па нейкіх спачатку незаўважальных, а пасля ўсё больш адчувальных прыкметах мы зразумелі, што едзем па зямлі другой рэспублікі, што вельмі хутка адбудзецца сустрэча з нашымі эстонскімі сябрамі.

І вось, вечарам 6 ліпеня на плошчы, перад гарадской ратушай, спыніліся нашы аўтобусы. Нас сустракалі эстонскія студэнты і арганізатары свята.

7 ліпеня — дзень рэпетыцый. Кожны калектыў рыхтаваўся з вялікім стараннем.

Самае галоўнае пачалося 8 ліпеня. У гэты дзень з самай раніцы да песеннага поля спяшаліся жыхары Тарту, Таліна і многіх іншых гарадоў Прыбалтыкі. Гледачоў сабралася не менш, чым 50 тысяч.

А што рабілася на вуліцах! Усе дэлегацыі рухаліся стройнымі яркімі калонамі па бясконцаму жывому калідору, які ўтварылі жыхары Тарту. Эстонцы сустракалі гарачымі апладысментамі кожную дэлегацыю і чулі ў адказ песні аб дружбе, аб маладосці.

Наша дэлегацыя скандыравала: «Няхай жыве Тарту!», «Прывітанне Эстоніі!». І ў адказ чуліся шчырыя словы ў наш адрас на эстонскай мове.

Капэла заспявала «Лявоніху» і проста на хаду, на шашы, кінуліся ў танцы ўсе ўдзельнікі нашага ансамблю. Незвычайнае, цудоўнае шэсце паказалі ўдзельнікі фестывалю песні. І вось голас сямітысячнага аб'яднанага хору. Здавалася: мы трапілі ў казку.

Добрую песню любяць усе. Яе нельга не любіць. Яна гаворыць аб тым, што хоча ведаць чалавек, што ён адчувае, што бачыць. Многа песен гучала над горадам Тарту, але, калі студэнты выконвалі свой старажытны гімн «Гаудэамус ігітур», усе гледачы ўсталі і, нягледзячы на пякучае летняе сонца, знялі галаўныя ўборы. Дырыжыравалі — вядомыя савецкія музыканты і кампазітары. Сярод іх — народны артыст СССР Густаў Эрнесакс, заслужаны дзеяч мастацтваў Рыхард Рытсінг, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Рыгор Сандлер, заслужаны артыст БССР Аляксандр Білібін і іншыя.

Ніколі не забыць факельнае шэсце вечарам 9 ліпеня. Вогненая рака працягнулася на паўтары кіламетры. І зноў гучала музыка і песні, зноў у гэтую ноч танцавалі і весяліліся студэнты.

Трэба аддаць пэўнае Эстоніі. Песню ў іх любяць і паважаюць. І нам было неяк трохі зайздросна, што гэтае свята было арганізавана ў іх, а не ў нас.

Наступіў дзень ад'езду. 10 ліпеня раніцай мы выязджалі з гэтага цудоўнага горада, з незабыўнага свята песні. Да пабачэння, Тарту! Мы ніколі не забудзем цябе! Мы вельмі хочам сустрэцца з тваімі студэнтамі на нашай беларускай зямлі. І гэта будзе, мы дачакаемся гэтага! Трэба толькі захацець!

Ф. ЛІЎШЫЦ.

# У БРАЦКАЙ КРАІНЕ



Вельмі да твару нашым студэнтам вопратка славацкіх шахцёраў.

АБМЕН студэнцкімі будаўнічымі атрадамі з'яўляецца важным сродкам умацавання дружбы і супрацоўніцтва паміж студэнцкай моладдзю краін сацыялістычнага лагера. У гэтым годзе наш універсітэт накіраваў студэнцкі будаўнічы атрад у Чэхаславацкую сацыялістычную рэспубліку. Праграма знаходжання ў ЧССР была наступнай: 30 дзён працы і 15 дзён адпачынку і экскурсій па краіне. 28 чэрвеня наш атрад выехаў з Мінска, і 30 чэрвеня мы ўжо былі на месцы.

Працавалі студэнты ў саўгасе, у г. Гандлёве, які размешчан у 65 кіламетрах ад Банска-Бістрыца. Гандлёва—шахцёрскі горад з 18-тысячным насельніцтвам. Нягледзячы на такую прафесію, гэта вельмі ўтульны і прыгожы горад. Трэба аддаць належнае яе жыхарам, якія вельмі старанна прыбіраюць вуліцы, паркі, скверы.

Мы прыехалі якраз у той час, калі зацвіталі ружы, і ўсе вуліцы патэналі ў яркачырвоных кветках. Нам гэта вельмі спадабалася. Але яшчэ больш мы былі ўражаны ад гасціннасці і цеплыні сэрцаў яго жыхароў. Нас сустракалі і прымалі тут як родных. За месяц знаходжання ў гэтым горадзе ў кожнага з нас з'явілася многа добрых сяброў і таварышаў.

Жылі мы ў інтэрнаце горнага прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, і амаль штодзённа на працягу месяца нас наведвалі не адзінкі, а дзесяткі мясцовых жыхароў. Гэта былі прамысловыя і сельскагаспадарчыя рабочыя, інтэлігенцыя, студэнты, навучэнцы школ, вучылішчаў... Прыходзілі яны да нас па розных пытаннях: паслухаць нашы песні, паглядзець на танцы, пагаварыць аб жыцці ў Савецкім Саюзе, аб нашых уражаннях на іх роднай зямлі. Вельмі часта і мы па іх запрашэнню наведвалі кватэры мясцовых жыхароў. Усюды, дзе б ні былі нашы студэнты, яны адчувалі цеплыню і павагу чэхаславацкіх сяброў. Па ініцыятыве кіраўніцтва шахты і саўгаса для нас была арганізавана двухдзённая паездка-экскурсія на Араўскае возера, недалёка ад граніцы з Польскай Народнай Рэспублікай. Па запрашэнню шахцёраў мы наведалі мясцовую шахту, гутарылі з актывам Саюза моладзі Чэхаславакіі.

У працоўны перыяд знаёміліся мы з гаспадаркай саўгаса, яго матэрыяльна-тэхнічнай базай, з характарам працы і адпачынку рабочых. У адзін з выхадных дзён для нас быў арганізаваны выезд у горы.

У цесных адносінах мы знаходзіліся са студэнцкай моладдзю. Па-першае, у складзе нашага атрада працавала 9 дзяўчат-студэнтак Педагагічнага Факультэта г. Банска—Бістрыца, па-другое мы часта сустракаліся са студэнтамі Медыцынскага факультэта горада Брацілавы, са студэнцкім будаўнічым атрадам Хімічнага Факультэта, таксама горада Брацілавы, у складзе якога налічвалася 10 чалавек з Венгерскай Народнай Рэспублікі. Сустрэчы праходзілі ў выглядзе сумеснага правядзення мастацка-тэматычных вечароў, спартыўных спаборніцтваў. І, нягледзячы на тое, што нам часта даводзілася праігрываць (у спорце), наша студэнцая дружба мацнела з кожным днём.

Многа было ў нас сустрэч са старымі камуністамі, удзельнікамі Славацкага паўстання 1944 года, партыйнымі дзеячамі.

Працавалі мы, у асноўным, на земляных работах, капалі траншэі, бетаніравалі сцены, рамантавалі і будавалі пад'язныя дарогі да дзвярэй ферм, сенавалі і г. д.

За добрую работу на будаўніцтве партыйная арганізацыя саўгаса ўзнагародзіла наш атрад Ганаровай граматай, а 9 чалавек узнагароджаны Ганаровымі значкамі ЦК ЧСМ. Сярод узнагароджаных значкамі былі студэнты А. Філімончык, В. Ярцаў (геаграфічны факультэт), М Бондар (гістарычны факультэт), У. Бубноў — асістэнт матэматычнага факультэта і іншыя.

Вельмі крыўдна бывае часамі, калі за граніцай прыходзіцца чырванець за свайго савецкага таварыша, за яго паводзіны, адносіны да працы. Так, студэнт-гісторык Калеснікаў не толькі абыякава адносіўся да працы, але і дапускаў парушэнні дысцыпліны. Нездавальняюча працаваў на будоўлі М. Германаў, таксама студэнт-гісторык. Многа крытычных заўваг можна выказаць у адрас студэнтаў фізічнага факультэта Б. Замскага і У. Гамозава.

У канцы ліпеня мы закончылі работу і накіраваліся на экскурсію па краіне. З буйнейшых, сусветна-вядомых гарадоў Чэхаславакіі мы наведалі Прагу і Карлавы Вары. У Празе азнаёміліся з гістарычнымі помнікамі, наведвалі музеі, карцінныя галерэі і іншыя памятныя месцы горада. Злата—Прага проста пакарыла нас сваёй прыгажосцю і велічнасцю. Пасля знаёмства з гэтымі гарадамі мы выехалі на сваю радзіму, у Савецкі Саюз. У нашых сэрцах надоўга застануцца ўспаміны аб Чэхаславакіі, аб цудоўным і гасцінным народзе гэтай краіны.

**Н. БАЗЫЛЕЎ,**
**асістэнт кафедры палітэканоміі, камандзір студэнцкага будаўнічага атрада.**

# СПАРТЫЎНЫЯ ГАРЫЗОНТЫ

Кожны год са сцен універсітэта выходзяць сотні спецыялістаў розных прафесій: біёлагі, гісторыкі, фізікі, журналісты. У іх на грудзях упершыню заззяе яскравымі промнямі значок выпускніка вну. А побач з гэтым значком красуецца і другі. «Майстар спорту СССР» ці «І разрад». Гэта вы можаце ўбачыць амаль на кожным пятым студэнту, які заканчвае наш універсітэт. Так, амаль кожны пяты студэнт БДУ — спартсмен-разраднік.

Універсітэт не толькі школа навуковых кадраў але і кузня, дзе фізічна загартоўваецца моладзь. 1350 юнакоў і дзяўчат займалася ў мінулым годзе па 23 відах спорту. Усе чатыры спартыўныя залы былі кожны дзень запоўнены студэнтамі. Тут — майстры спорту і тыя, хто ўпершыню прыйшоў у секцыю.

Канешне, нялёгка спалучаць вучобу і спорт. Але для, тых, хто хоча быць загартаваным, мужным, гэта толькі прыносіць карысць. Як правіла, студэнты, якія займаюцца фізічнай культурай і спортам, добра вучацца.

Беларускі дзяржаўны універсітэт уносіць вялікі ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту нашай рэспублікі. Спаборніцтвы сярод вышэйшых навучальных устаноў паказалі, што спартыўны калектыў універсітэта займае ганаровае месца разам з такім моцным калектывам як Інстытут фізкультуры.

Вось прыклад. У мінулым годзе каманда шашыстаў нашага універсітэта ў ліку шаснаццаці мацнейшых трапіла ў фінал спаборніцтваў вну Савецкага Саюза. Сярод удзельнікаў налічвалася 30 майстроў спорту. Гэта ўжо гаварыла аб тым, колькі адказнасці было ў нашых спартсменаў. У іх былі моцныя сапернікі —каманда Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта, Адэскага тэхналагічнага і Казанскага інжынерна-будаўнічага інстытутаў. У самым цяжкім матчы, з адэсітамі, шашысты БДУ атрымалі перамогу з лікам 3,5:2,5. Нарэшце фінал: БДУ — Горкаўскі дзяржаўны універсітэт. Так, нашы спартсмены ўпершыню ў гісторыі сталі чэмпіёнамі Савецкага Саюза сярод вну. Гэта вялікая заслуга спартсменаў універсітэта і ўпершую чаргу двухразовай чэмпіёнкі Беларусі Лены Соркінай, чатырохразовага чэмпіёна СССР сярод юнакоў Анатоля Гантварга, чэмпіёна Беларусі сярод студэнтаў Уладзіміра Бяглеўскага і іншых. Характэрна тое, што ўсе яны матэматыкі. Нездарма ж матэматычны факультэт называюць факультэтам шашыстаў. Таму перад першакурснікамі-спартсменамі гэтага факультэта стаіць вялікая і ганаровая задача— утрымаць гэтую слаўную традыцыю.

Мы яшчэ ганарымся тым, што выкладчык кафедры фізвыхавання, трэнер секцыі класічнай барацьбы В. Фефелаў стаў залатым прызёрам на Чацвёртай юбілейнай спартакіядзе народаў СССР па гэтаму віду спорта.

Бадай ніколі спартсмены універсітэта не дабіваліся такіх поспехаў, як за апошнія гады. Трэба сказаць, што іх становіцца ўсё больш і больш па колькасці і па якасці.

Добры старт узяла парашутная секцыя. У яе яшчэ мала заслуг, але тое, што за адзін год лік спартсменаў секцыі павялічыўся амаль у тры з паловай разы, даказвае, што парашутысты БДУ сур'ёзна настроены да адказных паядынкаў пад блакітным купалам неба.

Нямала сярод былых выпускнікоў, якія памнажалі спартыўную славу універсітэта, тых, хто і зараз не парывае сувязі са спортам. Уладзімір Трафімавіч Воднеў, намеснік дэкана матэматычнага факультэта, у час вучобы займаўся веласіпедным спортам. У яго першы разрад. Ён і цяпер прымае ўдзел у судзейскай калегіі ў час спаборніцтваў веласіпедыстаў. Гэты спіс прадаўжаюць кандыдат гістарычных навук У. Цітон, у якога першы спартыўны разрад па лёгкай атлетыцы, Л. Станішэўскі, кандыдат хімічных навук, майстар спорту па класічнай барацьбе, аспірант матфака М. Антаневіч і шмат іншых.

Вельмі цяжка пералічыць усё тое, што зроблена кафедрай фізвыхавання, спартсменамі... Тры гады запар займаюць першыя месцы ў рэспубліцы секцыя мастацкай гімнастыкі, якой кіруе Ірына Уладзіміраўна Бедакурава, калектыў зборнай універсітэта па плаванню, спартыўнай гімнастыцы (жанчыны). Па веласіпеду (жанчыны) БДУ трымае трэцяе месца сярод спартсменаў таварыства «Буравеснік».

За мінулы год выхавана адзінаццаць майстроў спорта, дзевятнаццаць кандыдатаў у майстры, пяцьдзесят першаразраднікаў, сто дзевяноста чатыры другаразраднікі, тысяча трыста шэсцьдзесят тры трэцяразраднікі, дзвесце пяцьдзесят тры грамадскіх інструктары, дзвесце трыццаць шэсць суддзяў па розных відах спорту.

Кожны дзень у жыцці секцый — гэта новыя рэкорды: універсітэцкія, рэспубліканскія, усесаюзныя. Сёння — навічок, а праз некалькі месяцаў, глядзі ўжо, і — разраднік.

Перад студэнтамі-першакурснікамі неабсяжныя прасторы спартыўнай дзейнасці. Дзесяткі аб'яў запрашаюць іх у спартыўныя залы, у любую з секцый: лёгкай атлетыкі, гімнастыкі, вольнай і класічнай барацьбы, альпінізму, цяжкай атлетыкі, фехтавання, баскетболу... Па ўсіх дваццаці трох відах.

**А. ЦЕРАХОВІЧ.**

# СУСТРЭЧА НА ЛЕСНЕ

*Гэты матэрыял, які быў змешчан у славацкай мясцовай газеце «Голас шахцера» горада Гандлёва, дзе жылі і працавалі студэнты нашага універсітэта ў час летніх канікул, расказвае аб адной з сустрэч, што адбывалася паміж чэшскай і савецкай моладдзю на шахце Лесна.*

**У час свайго знаходжання ў СССР мы вельмі хутка прывыклі да слова «сустрэча». Яно абазначае падзею, калі дзве незнаёмыя групы людзей сустракаюцца, каб пазнаёміцца і пазнаць адзін аднаго. Такую сустрэчу арганізавалі мясцовыя камітэты ЧСМ і Кампартыі горада Гандлёва ў панядзелак на шахце Лесна.**

**Сустрэча прадстаўнікоў горада, студэнтаў СССР і Педагагічнага факультэта з Банскай Бістрыцы пачалася ўвогуле афіцыйна. Рабочы Алаіз Мікулаш пазнаёміў студэнтаў СССР і Педагагічнага факультэта з Банскай Бістрыцы з прадстаўнікамі горада Гандлёва, а таксама нашага прадпрыемства.**

**Як мы ўжо пісалі ў нашай завадской газеце, гэтыя студэнты працуюць брыгадай на дзяржаўных прадпрыемствах.**

**Пасля кароткай падзякі брыгадзіра студэнцкай брыгады за цёплы прыём пачалася сардэчная гутарка паміж студэнтамі. Зразумела: пасля перайшлі на «гармонік» і песні, якія былі агульнавядомымі. Хутка пасля гэтага ў шчырых гутарках завязалася новая трывалая дружба. Ларыса расказвала нешта пра свае студэнцкія сны, Вячэслаў практыкаваўся французскай мовай, Оля расказвала аб нядаўняй экскурсіі ў Высокія Татры, а лоўкі гарманіст з выпадковым барабаншчыкам арганізавалі «аркестр», які пачаў сваю праграму «леткай-енькай». Падарункі ад нашай моладзі падтрымалі добры настрой, асабліва калі ў іх рукі трапілі нашы кнігі «Гандлёва чырвоная і чорная», «Гандлёва і 50 гадоў футболу ў Гандлёве». Абмен адрасамі, аўтографы, на кнігах, узаемныя абяцанні пісаць — усё гэта яшчэ больш згуртавала сяброў. Мы ніколі не забываем, што іх бацькі прынеслі нам свабоду.**



Вялікай папулярнасцю ва універсітэце карыстаецца секцыя класічнай барацьбы.

## НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

# КАСТРЫЧНІКУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Да 50-годдзя Кастрычніка буйнейшае ў нашай краіне выдавецтва «Навука» выпускае ў свет шэраг кніг, якія абагульняюць шматгадовыя даследаванні савецкіх вучоных па гісторыі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Капітальная трохтомная манаграфія акадэміка І. І. Мінца ахоплівае вялікі перыяд, звязаны з першай сусветнай вайной, са звяржэннем самадзяржаўя, устанаўленнем дыктатуры пралетарыяту і стварэннем Савецкай дзяржавы. Раскрываючы сацыяльна-эканамічныя прадпасылкі рэвалюцыі ў Расіі, паказваючы нарастанне рэвалюцыйнага руху ў краіне і гераічную барацьбу партыі бальшавікоў на чале з У. І. Леніным за мір і свабоду, дэмакратыю і сацыялізм, аўтар дэтальна асвятляе гісторыю лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, падрыхтоўку і правядзенне Кастрычніцкага паўстання, стварэнне Савецкай дзяржавы.

Шырокія даследаванні правялі ленінградскія гісторыкі. У падрыхтаванай імі кнізе «Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне (Семнаццаты год у Петраградзе)» дадзена поўнае апісанне падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкага паўстання ў цэнтры рэвалюцыі — Петраградзе, палітычнае жыццё якога аказала ў тыя дні рашучы ўплыў на ход гісторыі рэвалюцыі ва ўсёй краіне.

Перавыдаецца перапрацаваны і дапоўнены новымі дакументамі аднатомнік «Гісторыя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Выйдзе ў свет апошні, трэці том «Пратаколаў Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта» — поўнага фондавага выдання дакументаў штаба ўзброенага паўстання і першага кіруючага органа Савецкай улады.

Дзве кнігі — «Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў у перыяд падрыхтоўкі Вялікай Кастрыніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі» (аўтар А. М. Андрэеў) і «Саветы ў першы год пралетарскай дыктатуры» (калектыў аўтараў — асвятляюць дзейнасць Саветаў у перыяд мірнага развіцця рэвалюцыі, пасля ліквідацыі двоеўладства, у час карнілаўшчыны, напярэдадні Кастрычніка і ў працэсе станаўлення Саветаў як органа ўлады дыктатуры пралетарыяту.

З юбілейнай сесіі, прысвечанаі перамозе Кастрычніцкай рэвалюцыі ў нацыянальных раёнах, выдавецтва «Навука» выпускае два тамы: «Перамога Савецкай улады на Украіне» і «Перамога Савецкай улады ў Прыбалтыцы». У першым — даследуецца сацыяльна-эканамічнае развіццё Украіны напярэдадні Кастрычніка, паказваецца барацьба украінскага пралетарыяту і бяднейшага сялянства пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі на розных этапах рэвалюцыі, выкладаецца характар першых сацыялістычных пераўтварэнняў, разглядаецца дзейнасць першага Украінскага Савецкага ўрада і мясцовых органаў улады. У другім — асвятленне развіцця імперыялізма ў Прыбалтыцы і рост рабочага і сялянскага руху напярэдадні Кастрычніцкай рэвалюцыі. паказана значэнне Кастрычніка. устанаўленне савецкай дзяржаўнасці прыбалтыйскіх народаў.

У юбілейным годзе завяршаецца выданне пяцітомнай серыі «Сацыялізм і камунізм». Выйдуць у свет «Эканамічныя заканамернасці перарастання сацыялізма ў камунізм» і «Палітычная арганізацыя савецкага грамадства».

У абароне заваёў першай у свеце сацыялістычнай рэвалюцыі прынялі ўдзел прадстаўнікі працоўных розных краін свету. Ахопленыя пачуццём пралетарскай салідарнасці, яны са зброяй у руках змагаліся на франтах грамадзянскай вайны супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў. Формам і характару інтэрнацыянальнага руху ў 1917—1920 гадах, уплыву інтэрнацыяналістаў на развіццё рэвалюцыйнага руху ў замежных краінах прысвечан зборнік «Удзел замежных працоўных краін у Кастрычніцкай рэвалюцыі».



Грыбная восень. Фотаэцюд А. Кадзета.

# СІНЯЯ, СІНЯЯ НАРАЧ

Каля 400 студэнтаў, савецкіх і замежных, адпачыла сёлета за дзве змены ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач. Цяжка злічыць тыя ўражанні, якія вынеслі студэнты з гэтага дзівоснага кутка прыроды! Тут усіх загарам аблівала пяшчотнае сонца, лашчыў грудзі шалаўлівы ветрык, у спякоту давала прахладу крыштальная нарачанская вада. Пругкія хвалі калыхалі пад вячэрнім небам і зорамі чоўны з закаханымі парамі. А колькі ўспамін засталося ад турысцкага паходу ў Швахты—Нарачанскую касу!

Многія в'етнамскія і афрыканскія студэнты разам з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі захапляліся помнікамі старажытнасці, архітэктурай сталіцы Літоўскай ССР, куды прыязджалі яны на экскурсію. Сапраўды, Вільнюс—гэта музей пад адкрытым небам. І лепш не назавеш.

Ягады, грыбы... Радасць працы ў падшэфных калгасах... Цяжка ўсе прыпомніць....

А калі ў бліжэйшым населеным пункце разбушавалася полымя пажару, побач з савецкімі студэнтамі былі і в'етнамскія, кубінскія і афрыканскія таварышы. Мужна і бясстрашна змагаліся са стыхіяй Фам Зыонг, Ву Нгок Ан, Чан Дык Цьен, Ле Цен Ці, Андрэ Акугна, Сісі Бэрці, Генры Акойя і многія іншыя. Кажуць, сябры пазнаюцца ў бядзе. Дружнымі агульнымі намаганнямі пажар быў патушаны. Жыхары і мясцовыя ўлады выказалі вялікую падзяку выхаванцам універсітэта.

Шмат мастацкіх фільмаў дэманстравалася ў клубе лагера. Праводзіліся тут і вечары, прысвечаныя нацыянальным святам краін, з якіх прыехалі студэнты, вечары адпачынку. Жаданымі гасцямі ў студэнтаў на вечары юрыдычных пытанняў і адказаў былі прафесар І. І. Гарэлік і старшы выкладчык Я. М. Ануфрыеў. Дацэнт Р. М. Круцько прачытаў для студэнтаў лекцыю аб міжнародным становішчы.

Гасцямі на Нарачы былі і чэхаславацкія і югаслаўскія студэнты, а таксама рабочыя электрамеханічнага завода, якія прыехалі сюды на фестываль, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. Паміж студэнтамі універсітэта і гасцямі праходзілі спартыўныя сустрэчы. Многія студэнты ўпершыню на Нарачы навучыліся плаваць, або атрымалі па аднамудвух відах спорту разрад.

Аб усім лепшым, што адбывалася тут, расказвала рэгулярна радыёгазета «Нарачанская хваля».

Многа людзей збіралася і каля насценнай газеты «Нарачанка», рэдкалегію якой узначальвала студэнтка-журналістка Наташа Захарава...

І вось зноў верасень. Засталіся толькі ўражанні.... Першы званок — і зноў за вучобу....

М. БІРАНСКІ.

## ТАВАРЫШЫ ПЕРШАКУРСНІКІ!

**Кожны год калектывы мастацкай самадзейнасці папаўняюцца новымі маладмыі талентамі з ліку студэнтаў-першакурснікаў. Несумненна, і сярод вас ёсць здольныя, вясёлыя, вынаходлівыя і таленавітыя людзі.**

**Калі ласка, запрашаем у нашы калектывы мастацкай самадзейнасці.**

**1. Народная харавая капэла, якой кіруюць заслужаны артыст БССР Аляксандр Іванавіч Білібін, канцэртмейстар Уладзімір Рыжы, хармейстэр Валянціна Іванова.**

**2. Народны аркестр народных інструментаў. Кіраўнік— Міхаіл Аркаддзевіч Лісіцын, канцэртмейсцер Валянцін Шчэрбак.**

**3. Эстрадны ансамбль. Кіраўнік — Авінір Давыдавіч Вайнштэйн.**

**4. Танцавальны калектыў. Кіраўнік—Ларыса Канстанцінаўнаў Алексютовіч.**

**Падрабязныя звесткі аб калектывах мастацкай самадзейнасці вы можаце атрымаць у праўленні клуба, якое знайходзіцца ў прафкоме універсітэта (п. № 205).**

## СУХЭ ДАШХОРЛО



30 ліпеня 1967 года трагічна абарвалася жыццё студэнткі V курса біялагічнага факультэта нашага універсітэта Сухэ Дашхорло.

Сухэ Д. прыехала з Мангольскай Народнай Рэспублікі ў Беларусь з тым, каб у нашым універсітэце авалодаць перадавой біялагічнай навукай, набыць спецыяльнасць фізіёлага чалавека і жывёлін і свае веды перадаць народу сваёй сацыялістычнай Радзімы.

У вучобу на працягу 4 гадоў яна ўкладвала высокія пачуцці адказнасці перад сваёй Радзімай.

Сухэ Д. праяўляла нястомную прагу да ведаў і вызначалася вялікай працаздольнасцю і мэтанакіраванасцю.

Нягледзячы на вялікія цяжкасці навучання на рускай мове, яна на працягу ўсіх гадоў вучобы ва універсітэце паказвала выдатную пасляховасць.

У студэнцкім калектыве Сухэ Д. была выдатным таварышам і заслужана карысталася павагай,, любоўю і аўтарытэтам. Яна была старшынёй Зямляцтва Мангольскіх студэнтаў, якія навучаліся ў вну горада Мінска. Удзельнічала ў мастацкай самадзейнасці Мангольскіх студэнтаў.

Наш факультэт страціў вельмі здольную студэнтку, якая падавала вялікія надзеі, а брацкі мангольскі народ—патрыётку, гарачую энтузіястку сваёй Радзімы.

**Калектыў выкладчыкаў і студэнтаў.**

## КРАСВОРД «ГЕАГРАФІЯ»



Па гарызанталі:

3. Горад у ААР. 5. Востраў Інданезіі. 8. Рака на востраве Новая Гвінея. 10 Возера Паўночнай Амерыкі. 11. Возера Японіі. 13. Зямля ФРГ. 15. Дзяржава Азіі. 18. Гара Антарктыды. 21. Вышэйшы пік Азіі. 25. Мора Малайскага архіпелага. 26. Прыток Дуная. 28. Прыток Іртыша. 29. Рака пустыні Такла-Макан. 30. Рака Эквадора.

Па вертыкалі:

1. Рака Індыі. 2. Прыток Рэйна. 4. Возера Фінляндыі. 6. Прыток Інда. 7. Возера Паўночнай Амерыкі. 9. Рака ў Чылі. 12. Возера ў Турцыі. 13. Мыс на поўначы Афрыкі. 14. Прыток Дуная. 16. Вулкан на Філіпінскіх астравах. 17. Рака СССР. 19. Група астравоў Інданезіі. 20. Горны масіў Цэнтральнай Азіі. 22. Паўвостраў Паўночнай Амерыкі. 23. Горы пустыні Сахара. 24. Возера Афрыкі. 26. Рака ў Албаніі. 27. Пагранічная рака СССР.

Склаў М. Шунькін, студэнт геолага-геаграфічнага факультэта.

Заўвага: Адказы на красворд пішыце на рускай мове.

**Партком, мясцком, камітэт камсамола і рэдкалегія газеты «Беларускі універсітэт» выказвае глыбокае спачуванне Сачанку Івану Іванавічу, супрацоўніку газеты, з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.**

Зак. № 1408. АТ 13619. Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Нам. рэдактара П. ТКАЧОЎ.